УДК 811.161.3’38

# ДА ПЫТАННЯ АБ СІСТЭМАТЫЗАЦЫІ ЖАНРАЎ КАНФЕСІЙНАГА СТЫЛЮ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Савіцкая І. У., канд. філал. навук, дацэнт**
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Анатацыя: у артыкуле прааналізавана гісторыя вывучэння праблемы ўнутрыстылевай дыферэнцыяцыі канфесійнага стылю ў мовазнаўстве, вызначаны і апісаны яго падстылі і жанры.

Ключавыя словы: канфесійны стыль, тыпалогія жанраў, малітоўны падстыль, прапаведніцкі падстыль, агіяграфічны падстыль.

# ON THE ISSUE OF SYSTEMATIZATION OF GENRES OF THE CONFESSIONAL STYLE IN THE MODERN BELARUSIAN LANGUAGE

**Savitskaya I. V., associate professor**
*Belarusian National Technological University*
*Minsk, Republic of Belarus*

Summary: the article analyzes the history of studying the problem of intra-style differentiation of confessional style in linguistics, defines and describes its sub-styles and genres.

Key words: confessional style, typology of genres, prayer sub-style, preaching sub-style, hagiographic sub-style.

Сістэма функцыянальных стыляў беларускай мовы дапаўняецца сення канфесійным стылем, вывучэнне маўленчых і тэкставых асаблівасцей якога, а таксама ўнутрыстылевая класіфікацыя з’яўляюцца надзвычай актуальнымі ў сучаснай лінгвістыцы.

У беларускім мовазнаўстве дыферэнцыяцыя тэкстаў розных жанраў канфесійнага стылю не праводзілася, у той час як у рускай лінгвістыцы даследаванню гэтай праблемы прысвечана вялікая колькасць прац. Тым не менш пытанне аб агульнапрынятай

тыпалогіі жанраў гэтага стылю, выдзяленне адзінага крытэрыю, які б дазволіў уявіць месца кожнага жанра ў сферы рэлігійнай дзейнасці, дагэтуль не вырашана як у айчыннай, так і ў замежнай навуцы. Цяжкасць выдзялення падстыляў і жанраў у канфесійным стылі, на думку К. В. Бобыравай, тлумачыцца складаным характарам камунікацыі ў рэлігійнай сферы, у межах якой выказванне перарастае свае межы і становіцца падзеяй [1, ст. 19].

Даследчыца прапаноўвае адрозніваць жанры рэлігійнага дыскурсу па наступных параметрах: ступень інстытуцыянальнасці, суб'ектна-адрасатная накіраванасць, падзейная лакалізацыя, сацыякультурная дыферэнцыяцыя, функцыянальная спецыфіка і палявая структура. Ужываючы тэрмін «першасныя і другасныя жанры», аўтар проціпастаўляе іх па прыкмеце прамой або асацыятыўнай сувязі з зыходным біблейскім тэкстам [1, с. 29].

Л. П. Крысін выдзяляе такія жанры канфесійнага стылю, як павучанне, малітва, прытча, споведзь, пропаведзь. Акрамя таго, ен адзначае розныя жанры ў багаслоўскай літаратуры і богаслужэбных тэкстах: акафіст, екцення, псалом і інш. Біблія, на думку вучонага, адрозніваецца стылістычнай разнастайнасцю і аб'ядноўвае ў сабе рысы розных жанраў [4, ст. 290].

Найбольш поўную класіфікацыю прыводзіць І. У. Бугаева. Яна выдзяляе шэсць падстыляў рэлігійнага стылю: 1) падстыль богаслужбовых кніг; 2) малітоўны падстыль; 3) падстыль прац айцоў і настаўнікаў Царквы; 4) гімнаграфічны падстыль; 5) прапаведніцкі падстыль; 6) настаўніцкі падстыль [2, с. 3–11].

У рускім мовазнаўстве есць даследаванні, прысвечаныя вывучэнню асобных жанраў канфесійнага стылю. Напрыклад, жанру малітвы прысвечаны працы К. А. Архіпавай (2013), Э. М. Афанасьевай (2000), М. С. Берандзеевай (2015) і інш. Жанр акафіста аналізуюць І. П. Давыдаў (2003), А. І. Кузняцова (2006), В. А. Шапарава (2012) і інш. Жанр пропаведзі разглядаецца ў даследаваннях М. В. Анікушынай (2010), А. Л. Барышавай (2012), У. А. Бурцава (2012), Т. А. Крыловай (2005) і інш.

Мы выдзяляем у канфесійным стылі тры падстылі: ***прапаведніцкі, малітоўны і агіяграфічны***. Адсюль жанры гэтага стылю «маюць генетычнай падставай тры пратажанры – малітва, пропаведзь і жыціе» [3, ст. 71]. Адной з падстаў для такой дыферэнцыяцыі стылю, на нашу думку, служыць катэгорыя

адрасата; рэлігійная кумунікацыя з’яўляецца двухбаковай, бо ў дыялогу ўдзельнічае Бог і чалавек. Т.В. Іцковіч выдзяляе тры тыпы рэлігійнай камунікацыі: 1) чалавек звяртаецца да Бога; 2) Бог звяртаецца да чалавека; 3) чалавек звяртаецца да чалавека [3, с. 71].

Галоўнай мэтай ***прапаведніцкага падстылю*** з’яўляецца распаўсюджванне рэлігійных ісцін. Ен выкарыстоўваецца ў маўленні святароў, якія накіроўваюць вернікаў на выкананне хрысціянскіх дабрачыннасцей і пазбяганне грахоў, на імкненне да праведнасці. Адсюль гэты падстыль адрасаваны масавай аўдыторыі і накіраваны на сцвярджэнне і распаўсюджванне веры.

У сістэму жанраў прапаведніцкага падстылю ўваходзяць пропаведзь, пасланне, духоўная гутарка. Разнастайныя як па змесце, так і па форме, гэтыя жанры аб’ядноўваюць у сабе Адкрыцце (Боскія ісціны) і тлумачэнне гэтых ісцін, перакананне ў іх адрасата. Іх аўтарамі з’яўляюцца святары. У адносінах да адрасата прапаведнік займае пазіцыю духоўнага настаўніка; у той жа час, з’яўляючыся пасрэднікам паміж вернікамі і Богам, ен застаецца роўным сваей пастве перад Богам.

У сучаснай рэлігійнай камунікацыі вельмі распаўсюджаны ***малітоўны падстыль***, які праяўляецца, у першую чаргу, у малітве. Малітва характарызуецца прамым зваротам да Бога, Багародзіцы або да святых з просьбай аб міласці або пакаяннем, з хвалой або ўдзячнасцю. Малітвы можна падзяліць на грамадскія і асабістыя.

Грамадская малітва – гэта ўзнаўленне кананічнага малітоўнага тэксту. У час літургіі гэтае ўзнаўленне становіцца калектыўным, што ўзмацняе эмацыянальнае ўздзеянне малітвы, прычым святар з’яўляецца абавязковым удзельнікам камунікацыі.

Асабістая малітва таксама будуецца на базе кананічнага тэксту, але дапаўняецца эмацыянальным выкладам асабістай просьбы або ўдзячнасці; яна можа ўяўляць сабой і ўласны маналог верніка. Асабістая малітва з’яўляецца асабістым выражэннем веры, гэта размова з Богам без пасрэднікаў.

***Агіяграфічны падстыль*** выяўляецца ў жыціях. Жыціе – гэта рэлігійны жанр, які ўтрымлівае жыццяпіс прадстаўнікоў хрысціянскай веры, мучанікаў і праведнікаў. Гэты жанр мае вялікае выхаваўчае значэнне, паколькі адрасату прад’яўляецца ўзор, з якім вернік павінен суадносіць уласныя дзеянні.

Евангелле з’яўляецца нязменным арыенцірам для хрысціяніна ў дасягненні галоўнай мэты – выратавання. Аднак Царква пастаянна кананізуе праведнікаў і мучанікаў за веру, вынікам чаго і з’яўляецца стварэнне жыццій кожнага з іх. Мэта жыція – наглядна на прыкладзе асобнага існавання паказаць, што ўсе, што патрабуюць ад звычайнага чалавека запаведзі, не толькі можна выканаць, але і не раз выконвалася, пацверджаннем чаму і з’яўляюцца жыццеапісанні праведнікаў і мучанікаў.

У аснове жыційных тэкстаў ляжыць аповед. Звычайна гэта біяграфія пэўнай асобы, выкладзеная ў храналагічным парадку ў дакументальна-мастацкай форме. Ад звычайнай біяграфічнай нататкі жыціе адрозніваецца тым, што канкрэтнае чалавечае жыцце тут трактуецца як місія ў імя Бога.

Усе тры падстылі – прапаведніцкі, малітоўны і агіяграфічны – прайшлі свой працэс развіцця, кожны на сваей тэкставай аснове. Пропаведзь, малітва і жыціе працягваюць свае актыўнае існаванне і ў сучаснай сферы рэлігійнай дзейнасці, займаючы цэнтральнае становішча ў жанравай сістэме канфесійнага стылю.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Бобырева Е. В. Религиозный дискурс: ценности, жанры, стратегии (на материале православного вероучения): автореф. дис. ... д-ра филол. н.: 10.02.19 / Е. В. Бобырева. – Волгоград, 2007. – 37 с.

2. Бугаева И. В. Стилистические особенности и жанры религиозной сферы / И. В. Бугаева // Стилистика текста. Межвузовский сборник научных трудов / Отв. ред. Е. В. Плисов. – Н. Новгород: НГЛУ им. Н.А. Добролюбова, 2005. – С. 3–11.

3. Ицкович Т. В. Жанровая система религиозного стиля на коммуникативно-прагматическом и категориально-текстовом основаниях: дис. … д-ра филол. н.: 10.02.19 / Т. В. Ицкович. – Екатеринбург, 2016. – 387 с.

4. Крысин Л. П. Русское слово, свое и чужое: исследования по современному русскому языку и социолингвистике / Л. П. Крысин. – М.: Языки славянской культуры, 2004. – 888 с.